**Дыялогавая пляцоўка ў рамках пасяджэння клуба «Вялікае сэрца»**

14 кастрычніка ў Дзень маці ў рамках пасяджэння клуба «Вялікае сэрца» ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» сумесна з ДУК "Раённы цэнтр культуры» арганізавана дыялогавая пляцоўка для наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў і іх бацькоў. У дыялогавай пляцоўцы прынялі ўдзел начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Ашмянскага райвыканкама Губарава Ірына Францаўна, дырэктар ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна» Невяркевіч Лілія Мікалаеўна, спецыялісты аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў.

Людзі з абмежаванымі магчымасцямі і іх бацькі атрымалі вычарпальную інфармацыю аб ільготах і гарантыях, паслугах для людзей з інваліднасцю сем'ям з дзецьмі-інвалідамі. Бацькі задавалі пытанні аб ільготах пры аплаце камунальных паслуг, умовах атрымання гуманітарнай дапамогі, аб прадастаўленні паслуг цырульніка на хаце і інш.

Завяршылася дадзенае мерапрыемства канцэртнай праграмай, прысвечанай Дню маці. Наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў разам з бацькамі ўдзельнічалі ў конкурсах, спявалі песні, танцавалі. Заключным момантам свята стала ўручэнне падарункаў для любімых мам.







